**СÓЛАПАЎ** Міхаіл Рыгоравіч (н. 15.10.1924, с. Пакроўскае Цярбунскага раёна Ліпецкай вобл., Расія), баяніст, педагог, дзеяч аматарскага мастацтва. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1963). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1992). Прафесар (1980). Скончыў Маскоўскі музычна-педагагічны інстытут імя Гнесіных (1955). З 1948 у Брэсце: выкладчык музычных навучальных устаноў, арганізатар калектываў мастацкай самадзейнасці (гарадскога сімфанічнага аркестра пры музычным вучылішчы, нар. харавой капэлы настаўнікаў і інш.), дырэктар Раснянскай эксперыментальнай музычнай школы Камянецкага раёна (1967—70). З 1966 выкладчык Бел. акадэміі музыкі (у 1973—79 загадчык кафедры нар. інструментаў). Аўтар артыкулаў па пытаннях музычнага выканальніцтва, гісторыі нар. інструментальнай культуры Беларусі, метадычнай літаратуры. Аранжыроўшчык бел. нар. песень і найгрышаў для баяна, цымбалаў, акардэона, аркестраў і ансамбляў розных складаў бел. нар. інструментаў. Сярод апрацовак бел. нар. песні «Верабейчык», «Уцякай, мароз-дзядуля», «Козлік», «Ой, ляцелі гусі з броду», «Жаваронačкі, прыляціце», «Перапёлачка», «Шостак», «Сватoк», «Дубочак зялёненькі», «Саўка ды Грышка дзелалі дуду», «Ці ў полі не калінка расла», «Калыханка», «Ой, рана на Йвана», «Прыляцелі гусі», «А ў полі вярба», «Кума, мая кумачка», полька «Радасць» і інш.


*М. Р. **Солапаў**.*

*Літ.*: Сурскі А. Баец культурнага фронту // Беларусь. 1961. № 9; Цыпин Г. Брестские впечатления // Сов. музыка. 1966. № 8.

*А. В. Скорабагатчанка.*

**СОЛЬ**. Займае выключнае месца ў фальклоры, традыцыйнай абрадавай практыцы і магіі беларусаў, з'яўляючыся абавязковым атрыбутам каляндарных і сямейна-родавых святкаванняў, лячэбным сродкам у нар. медыцыне, знахарстве, надзейным абярэгам («нячыстая сіла баіцца С., «як чорт ладана»). Здаўна С. лічылася вельмі дарагім мінералам, таму да яе ставіліся беражліва. Існавала прыкмета: калі рассыплецца С. — дамачадцы абавязкова пасварацца паміж сабою. У такіх выпадках меркавалі, што гэта нячыстая сіла бесіцца і імкнецца пазбавіць жытло чалавека надзейнага абярэга. Каб адвесці бяду ў бок, некалькі драбінак С. клалі сабе на галаву або бралі ў тры пальцы правай рукі і кідалі праз левае плячо, сказаўшы пры гэтым замоўныя словы на добрае жыццё. На працягу года існавала некалькі дзён, калі гатавалі «рытуальную» С. Найбольш спрыяльным лічыўся Чысты чацвер, калі С. «перапальвалі» на патэльні ў печы і асвячалі ў царкве. Самай эфектыўнай, надзейна перасцерагаючай ад бяды і няшчасцяў не толькі хату, але і чалавека, была С., якая ў ноч з серады на чацвер стаяла ў двары пад зорамі («С. на сямі вятрах»). Яе выкарыстоўвалі для вырабу абярэгаў, амулетаў і талісманаў (некалькі драбінак С. засыпалі ў маленькі мяшэчак, пашыты з чырвонай тканіны, і на працягу года насілі каля сэрца). Жанчыне, толькі што нарадзіўшай дзіця, бабка-павітуха націрала С. лоб, перасцерагаючы ад сурокаў. Асвячонай С. тройчы па сонцы абносілі вакол дзіцяці, каб зняць сурокі або пужанне, ці кідалі тры драбнічкі С. ў шклянку з вадой і шапталі над ёю замоўныя словы: «Урок-урочышчэ, ідзі на цяплішчэ. Ад каго стала, штоб на ім цела патрашчала. Соль яму ў вочы, галаўня ў плечы». Пасля ёю абціралі твар і грудзі дзіцяці. Асвячоную С. выкарыстоўвалі для лячэння хатняй жывёлы: пяклі невялічкія «калабкі» з жытняй мукі, у якія замешвалі «чацвярговую» С. У дзень памяці святой Агаты (18 лютага) у цэрквах асвячалі хлеб з С. і захоўвалі ў хатах як абярэг ад пажару: «Соль святой Агаты бароніць ад агню хаты». Былі сітуацыі, калі С. нельга было дабаўляць у ежу або печыва. Не салілі хлеб, калі пяклі яго на памінкі і Дзяды. На Раство Хрыстова разам з блінам пяклі праснакі з несалёнага прэснага цеста. Іх хавалі да Вадохрышча, акраплялі святой вадою і аддавалі хатняй жывёле, каб яна захоўвала плоднасць, была здаровай і няўрочнай. Не салілі кашу, якую гатавалі для Дамавіка. Існавалі забароны і рэгламентацыі ў адносінах да С.: нельга было макаць у сальнічку хлебам, кідаць С. на агонь (каб не справакаваць сварку), пазычаць, дарыць або прыносіць у чужую хату. С. выкарыстоўвалі ў некаторых аказіяльных абрадах або нечаканых сітуацыях. Для таго, каб выклікаць дождж, жанчыны-ўдовы кідалі ў 9 калодзежаў самасейны мак, зерне ільну і асвечаную С. Калі хто-небудзь з падарожнікаў прасіў у гаспадыні кубак малака, тая ніколі не адмаўляла,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

але пры гэтым кідала на дно кубачка некалькі драбінак С., каб чужы чалавек не сурочыў карову і «не забраў» малако з сабой. Тую ж ахоўную ролю выконвала С. на вясельных караваях. Матыў выкарыстання С. шырока прадстаўлены ў нар. замовах. Адганяючы ад чалавека бяду, знахар гаварыў: «Соль таму ў вочы, хто дабра нам ня хоча».

*Літ.*: Замовы. Мн., 1992; К р у к Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001.

*А. В. Катовіч.*

**СО́ЛЬНА-ГУРТАВЫ́Я ТА́НЦЫ**, разнавіднасць гуртавых танцаў, вызначальнай прыкметай якіх з'яўляецца адвольна-пачарговае выкананне танцорамі сольных партый (часцей у коле) ва ўзаемадзеянні з інш. ўдзельнікамі. Складаюць пераважна групу ***імправізаваных танцаў*** («Боб малаціць», «Рассыпухі», «Калінка-малінка», «Чаравічкі», «Восем дзевак — адзін я» і інш.), а таксама ***ілюстрацыйна-выяўленчых танцаў*** («Зайчыкі», «Верабей», «Пеўнік», «Шчыглік», «Бацян» і інш.). Музычны памер 2/4. Выконваюцца на розныя мелодыі пад інструментальнае (сольнае, ансамблевае) суправаджэнне з прыпеўкамі. Маюць прымеркаванне да *Каляд* (асобныя варыянты танцаў «Каза», «Мядзведзь», «Бусел», «Магера» і інш.), *Вяселля* («Прыспеў», «Грэчка», адзін з варыянтаў танцаў «Чобаты», «Чамель», «Вясельныя прыпеўкі» і інш.) ці выконваюцца ў любы час (асобныя варыянты «Лявоніхі», «Барыні», «Сербіянкі», «Шахцера», «Кругавая», «Расходуха», «Барадайка» і інш.). Маюць нескладаную, пераважна адначасткавую форму з імправізаванай або рэгламентаванай структурай. Асобным варыянтам з двухчасткавай формай уласціва чаргаванне хуткага, умеранага ці павольнага тэмпаў («Шастак», «Грэчанікі» і інш.). Асноўныя прасторавыя малюнкі — кола, паўкола ў іх дынамічных і статычных праявах. Лексіка мае скокавы стыль: для рухаў ног характэрны крокі, дробы, «калупалачкі», падбіўкі, прысядкі і інш.; для рухаў рук — узмахі, плясканні, пераводы з паставы ў паставу і інш. У шматлікіх спалучэннях яны ўтвараюць новыя пластычна-рытмічныя формы.

*М. А. Козенка.*



***Сольна-гуртавы танец*** *«Боб малаціць». Вёска Клясціцы Расонскага раёна.*

**СО́ЛЬНЫЯ ТА́НЦЫ**, група ***імправізаваных танцаў*** і ***ілюстрацыйна-выяўленчых танцаў***, якія выконваюцца адным чалавекам. Выканаўца яскрава праяўляе свае рознабаковыя мастацкія здольнасці, фізічную падрыхтаванасць, уменне імправізаваць. Выконваюцца пераважна пад інструментальнае суправаджэнне, а таксама песеннае, «пад язык», рытмічныя плясканні ў далоні ці ў спалучэнні розных відаў акампанементу. Для іх характэрна імправізаваная кампазіцыя і лексіка, нерэгламентаваная структура. Складаюцца з трох падгруп: уласна імправізаваныя танцы (сольныя *скокі*); танцы з яскрава выяўленым сюжэтам («Шавец», «Чобаты», «Лапці», «Каваль», «Дударык» і інш.); танцы з арганічным спалучэннем элементаў харэаграфіі і прозы («Барыня пад расказ», «Барыня з карцінкамі» і інш.). Кожнаму тыпу С.т. уласцівы набор рухаў, характэрны для пэўных лексічных груп. Для танцаў тыпу «Казака» («Рускі», «Барыня», «Казачок», «Беларускі казачок», «Маларасійскі казачок», «Палескі казачок», «Гапак», «Гапачок», «Яблычка», «Ухар», «Ухар-купец», «Трапак» і інш.) характэрны прысядкі, дробы, плясканні па нагах, «калупалачкі», «вяровачкі», падбіўкі, махалачкі і інш., якія перамяжоўваюцца своеасаблівымі праходкамі; тыпу «*Мікіты*» («Таўкачыкі», «Заяц», «Чыбір» і інш.) — розныя пераскокі і рухі тыпу «па-дэ-баска»; тыпу «Жабкі» («Жабка»,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ